УДК 947.6.«18/19»

У. М. Сцебурака, асістэнт

# ТРАНСФАРМАЦЫЯ ОРГАНАЎ УЛАДЫ ПАСЛЯ ЛЮТАЎСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ 1917 Г. НА БЕЛАРУСІ

The article contains information about problems of governing in Belarus after the February revolution of 1917. Here are denoted and characterized the most important moments of relations between central and local authorities, here are presented it's organizational and structural changes. In this work we give some examples of the transformation process which took plase in the studing period. The article is devoted to the problems of formation and development of the democratic goverment during The First World War.

**Уводзіны**. Праблематыцы падзей Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. прысвечана значная колькасць гістарычных прац, але ў савецкі перыяд тэма Лютаўскай рэвалюцыі праходзіла як другасная, якая проста папярэднічала наступнай лёсавызначальнай падзеі – кастрычніцкаму ўзброенаму паўстанню ў Петраградзе. Было прынята лічыць, што сэнс усіх змен быў у жорсткай класавай барацьбе, але зараз зразумела, што 1917 г. найбольш яскрава праяўляецца ў лёсе дэмакратычнай альтэрнатывы, якая бадай што ўпершыню гэтак магутна праявіла сябе на расійскай прасторы пасля краху царызму. Рэвалюцыйная дэмакратыя ў тыя часы фактычна была па-за канкурэнцыяй, бо мела рэальную сацыяльную падтрымку грамадства. Важную ролю ў тым крэдыце даверу, які атрымаў Часовы ўрад ад насельніцтва, бачыцца ва ўзважаным падыходзе да праблемы функцыянавання органаў кіравання. Гэты падыход як працэс найбольш еміста характэрызуецца тэрмінам «трансфармацыя», што азначае пераўтварэнне, змяненне нечага з захаваннем важных ранейшых уласцівасцяў.

У гэтых абставінах надзвычай важным бачыцца зварот увагі да пытанняў, што тычацца змен у механізме дзяржаўнай машыны. Адным з галоўных складальнікаў падзей рэвалюцыйных часоў з'уляецца комплекс праблем, звязаных з сістэмай кіравання дзяржавай. Менавіта пераход ад самаўладдзя да дэмакратыі, канструкцыя сістэмы ўлады на месцах і ў цэнтры, асаблівасці функцыянавання органаў улады на Беларусі, іх суіснаванне на дадзеным этапе патрабуюць дасканалага вывучэння, бо доўгі час гэтыя пытанні заставаліся другараднымі, саступаючы па важнасці палітычнаму напаўненню тых падзей.

**Асноўная частка.** Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. пазбавіла Расію манархічнага ладу і прывяла да ўлады Часовы камітэт Дзяржаўнай думы, які «ўзяў у свае рукі стварэнне нармальных умоў жыцця і кіравання ў сталіцы і заклікаў дзейсныя войскі і флот захоўваць поўны спакой...» [1, с. 3]. Часовы камітэт Дзяржаўнай думы здолеў засяродзіць уладу ў сваіх руках як у сталіцы, так і ў дзяржаве наогул. Найперш перад ім паўсталі задачы стабілізацыі становішча. У сувязі з гэтым ліквідуюцца найбольш адыёзныя інстытуты старой улады – паліцыя, жандармерыя, установы Міністэрства двара, губернатары, земскія начальнікі. 8 сакавіка Часовы ўрад прымае пастанову аб утварэнні Надзвычайнай следчай камісіі па расследванні злоўжыванняў былых царскіх міністраў. У сакавіку аб'яўляецца палітычная амністыя, а ў красавіку скасоўваецца і адміністратыўная высылка. Пачатак быў пакладзены, але было зразумела, што ліквідацыя асобных інстытутаў царскай сістэмы кіравання сама па сабе не магла стварыць трывалы падмурак для новага ладу і таму важнае месца было адведзена распрацоўцы будучай мадэлі дзяржаўнасці Расіі. Ужо 8 сакавіка пачынаецца падрыхтоўка палажэнняў аб выбарах ва Устаноўчы сход, а 21 красавіка ствараецца Асобая нарада па распрацоўцы праекта палажэння аб выбарах у яго.

Пачынаецца праца па перабудове апарату кіравання на месцах. 4 сакавіка Часовы ўрад прымае пастанову «аб рэарганізацыі адміністратыўнай улады на месцах», згодна якой ад улады былі адхіленыя губернатары і віцэ-губернатары. Ствараліся новыя ведамствы: 10 сакавіка 1917 г. – Часовае ўпраўленне па справах грамадскай паліцыі, 22 сакавіка – Юрыдычная нарада пры Часовым урадзе. Апошняя кантралявала пастановы, праводзячы юрыдычныя экспертызы. Краіна імкліва ўваходзіла ў новы этап свайго развіцця. Газета «Речь» у тыя дні пісала: «Для Расіі надыходзіць эпоха самадзейнасці і самакіравання. Грамадства стварае свае камітэты, саветы, камісарыяты, якія імкнуцца ўрэгуляваць забеспячэнне насельніцтва харчовымі прадуктамі і г. д.» [2]. Прызнавалася пажаданым захаванне існуючага адміністратыўнага механізма для падтрымання нармальнага ходу жыцця. Такім чынам, гаворка ішла пра прыстасаванне старой сістэмы кіравання да новых умоў, што азначала захаванне пэўнай пераемнасці ў сістэме органаў улады, а не яе карэнную ломку. Гэтая з'ява найбольш паслядоўна прасочваецца на ўзроўні ўсталявання ўлады грамадскіх камітэтаў і камісараў Часовага ўрада, а таксама на працэсе стварэння міліцыі – найбольш важных элементаў сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў, якія найперш адчулі на сабе

ўздзеянне ліберальных павеваў дэмакратычнай рэвалюцыі.

У першыя дні сваёй працы члены Часовага ўрада звярнуліся да кіраўнікоў губернскіх земстваў і гарадскіх самакіраванняў з заклікам аб стварэнні грамадскіх органаў кіравання з мэтай аховы парадку, спакою і харчовага забеспячэння насельніцтва [3]. Для стварэння камітэтаў грамадскай бяспекі склікаліся агульнагарадскія сходы ці пашыраныя пасяджэнні гарадскіх самакіраванняў. На Беларусі ў сакавіку 1917 г., як і па ўсёй краіне ў цэлым, ствараліся грамадскія камітэты ў губернях, паветах і валасцях. Адначасова з узнікненнем грамадскіх камітэтаў адбывалася фарміраванне і ўсталяванне губернскіх камісарыятаў.

У Мінску 3 сакавіка пасля абмеркавання тэлеграмы, якая прыйшла з Петраграда на адрас губернскай управы і гарадской думы, кіраўнікі апошніх Б. М. Самойленка і С. Б. Хржанстоўскі дасягнулі пагаднення аб усталяванні ў горадзе часовага грамадскага органа для падтрымкі спакою і парадку. На сходзе з удзелам каля 70 чалавек пад старшынствам Б. М. Самойленкі былі выказаны прапановы «ўсталяваць Камітэт грамадскай бяспекі, абраць грамадзянскага камендманта для загадвання паліцыяй і міліцыяй і прасіць галоўнакамандуючага зацвердзіць камітэт і каменданта». Па прапанове С. Б. Хржанстоўскага грамадзянскім камендантам быў абраны Б. М. Самойленка [3]. 5 сакавіка старшыня Часовага ўрада накіраваў на адрас старшынь губернскіх земскіх упраў тэлеграмы аб ускладанні на іх абавязкаў па кіраванні губернямі ў якасці губернскіх камісараў з захаваннем функцый іх папярэднікаў (губернатараў) [4, л. 16]. На Беларусі першымі губернскімі камісарамі сталі: Б. М. Самойленка (Мінская губерня), В. А. Судзілоўскі (Магілёўская), М. Л. Карташоў (Віцебская). Абавязкі павятовых камісараў ускладаліся адпаведна распараджэнню Часовага ўрада на старшыняў павятовых земскіх упраў. Зводзіліся функцыі новых чыноўнікаў найперш да кантролю над такімі надзённымі і неадкладнымі справамі, як захаванне грамадскага парадку, забеспячэнне прадуктамі насельніцтва, рэарганізацыя праваахоўных органаў і фарміраванне апарату мясцовай улады ўсіх узроўняў. Так, у гэтым рэчышчы дзейнічаў мінскі губернскі камісар Б. М. Самойленка, які для рэарганізацыі ўлады і аховы грамадскага парадку ў губерні стварыў групу ўпаўнаважаных, якая стала асновай губернскага выканаўчага камітэта (камісарыята), у складзе работнікаў УЗС, Земгара, ВПК, губернскага земства, мінскай думы ды інш., усіх 7 чалавек. З 9 сакавіка пачала выходзіць газета «Вестник Минского губернского комиссара», якая публікавала афіцыйныя дакументы, цыркуляры і інш. Апарат кіравання стварауся і ў паветах Мінскай губерні. На працягу сакавіка там адбыліся сходы земстваў з удзелам землеўладальнікаў, духавенства, чыноўніцтва, гандляроў, сялянства, рамеснікаў, якія фарміравалі павятовыя камісарыяты і вылучалі прадстаўніцтва ў губернскі камісарыят [5].

У Магілёве пры губернскім камісары В. А. Судзілоўскім быў створаны часовы губернскі камітэт з удзелам членаў губернскага і павятовага земстваў. Як і ў Мінскай губерні, тут адбывалася рэарганізацыя земстваў і фарміраванне павятовых камісарыятаў. Гэтая праца была праведзена і ў Гомелі, дзе земская ўправа на чале са старшынёй падала ў адстаўку, а да ўдзелу ў фарміраванні новай улады атрымалі доступ «выбарныя ад сялян і дэмакратычных груп» [6, л. 28].

Акрамя стварэння азначаных структур, у першыя дні працы Часовы ўрад выдаў пастановы, накіраваныя на стабілізацыю і паляпшэнне сітуацыі ў краіне. Сярод іх былі указы, што змяншалі напружанасць у грамадстве, выкліканую злоўжываннямі царскіх чыноўнікаў, рэпрэсіўнай дзейнасцю судовага і паліцэйскага апаратаў. Пастановай ад 10 сакавіка 1917 г. скасоўваўся дэпартамент паліцыі і стваралася Часовае ўпраўленне па справах грамадскай паліцыі [1, с. 27]. Гэты крок быў надзвычай важным, бо старая царская паліцыя была тым прадстаўніком дзяржавы, што меў найбольш шчыльны паўсядзённы кантакт з народам. Паліцыя ў Расіі была фактычна выканаўцам усіх распараджэнняў вышэйшых органаў улады, і таму яна мела сутыкненне з усімі сферамі жыцця шэраговага грамадзяніна. Яна без перабольшання можа быць названай адзіным пасярэднікам паміж уладай і насельніцтвам, таму яе ліквідацыя была адной з найбольш заўважных (разлічаных на станоўчы водгук грамадства) і адначасова адной з найбольш рызыкоўных змен у сістэме МУС. Акрамя паліцэйскага апарату быў скасаваны і інстытут жандармерыі, якая выконвала абавязкі выканаўчай паліцыі [7, с. 186].

Міліцыя Часовага ўрада напачатку стваралася пры адсутнасці адзіных і дакладных інструкцый адносна былой царскай паліцыі, што абумоўлівала living рознае стаўленне да яе з боку грамадскасці. Так, у сакавіку пашыранай з’явай былі арышты былых паліцэйскіх з далейшым накіраваннем іх у войска для адпраўкі ў дзеючыя часткі. МУС у маі 1917 г. выдала пастанову, якая загадвала ўсім былым паліцэйскім чынам, якія пакінулі скасаваныя пасады, з’явіцца ў прызыўныя пункты, каб прайсці агляд камісіі і папоўніць шэрагі ваеннаслужачых рэгулярнага войска [4, с. 41]. Адначасова здаралася, што былыя паліцэйскія кадры прыцягваліся да праваахоўнай службы (Гомель, Мінск, Магілёў) [3]. Так, паводле распараджэння магілёўскага губернскага камісара ад 6 сакавіка, дапускалася накіраванне «у дапамогу міліцыі, калі сустрэ-

нецца патрэба, чыноў мясцовай паліцыі, якія павінны знаходзіцца ў поўным яе распараджэнні» [10]. Невыпадкова, што пэўны час, асабліва ў сельскіх мясцовасцях, новым уладам для аховы парадку даводзілася скарыстоўваць былых паліцэйскіх. Дарэчы, і жандары нават пасля скасавання іх інстытута працягвалі выконваць звыклую працу, нягледзячы на недвухсэнсоўны загад Часовага ўрада спыніць усялякую дзейнасць. Напрыклад, начальнік Магілёўскага губернскага жандарскага ўпраўлення палкоўнік Яленскі хаця і загадаў 4 сакавіка сваім падначаленым спыніць палітычны росшук, арышты іназіранні на прадмет выяўлення недабранадзейнасці сярод насельніцтва, але прапанаваў працягваць «высвятленне агітатараў і падпольнага руху супраць вайны, мець усебаковае назіранне за рабочымі, што абслугоўваюць прадпрыемствы, якія працуюць на патрэбы абароны, у сэнсе папярэджання злаўмысных забастовак з мэтай падарваць узброеныя сілы арміі, а гэтаксама мець назіранне за войскамі ў сэнсе сувязі іх з агітатарамі супраць вайны» [6, с. 21].

Загады разышліся па губернях і паступова пачалі прыводзіцца ў дзеянне. У пачатку сакавіка 1917 г. у Мінску знешняя паліцыя была заменена на грамадзянскую міліцыю і быў створаны спецыяльны Часовы гарадскі камітэт з выканаўчай часткай для заведвання справамі міліцыі [3]. Было вырашана, што за думай застанецца выкананне толькі гаспадарчых функцый, а Камітэт грамадскай бяспекі павінен узяць у свае рукі частку: утварэнне міліцыі і зносіны з ваеннай уладай. Арганізацыя парадку была даручана М. А. Міхайлаву. Тут жа на сходзе быў распачаты запіс служачых у міліцыю [6, с. 15]. 4 сакавіка адбыўся агульны сход служачых і рабочых Усерасійскага земскага саюза. Паводле пастановы зноў абранага выканкама на базе гэтай арганізацыі ўтварылася гарадская міліцыя. У гэты ж дзень грамадзянскі камендант Б. М. Самойленка абвясціў загад аб прызначэнні М. А. Міхайлава «часовым начальнікам міліцыі УЗС па ахове парадку ў горадзе», загадаўшы таксама «гарадскім чынам паліцыі выдаць Міхайлаву зброю, якая маецца ў іх распараджэнні, па вопісу» [6, с. 15]. На працягу 4 сакавіка ў горадзе сіламі міліцыі былі заняты паліцэйскае ўпраўленне, ахоўны і вышуковы аддзелы і амаль усе паліцэйскія пасты. Паліцэйскія чыны перадалі зброю міліцыі Ўсерасійскага земскага саюза, якая ўзяла ўсе ўрадавыя ўстановы, пошту, тэлеграф пад сваю ахову. У той самы дзень адбылася нарада з удзелам Б. М. Самойленкі, С. Б. Хржанстоўскага, І. І. Віткевіча, некаторых членаў Камітэта грамадскай бяспекі, а таксама мінскага паліцмайстара А. А. Лебяды з нагоды ўтварэння ў горадзе міліцыі. Было вырашана фарміраваць яе з гараджан з часовым уключэннем чыноў паліцыі, «але з разбарам па рэкамендацыі жыхароў і падпарадкаваннем яе грамадзянскаму каменданту» [3]. За два тыдні сакавіка паўсюдна ў губерні адбыліся выбары ўчастковых начальнікаў міліцыі [9]. Для канчатковага сфарміравання міліцыі ў паветах у распараджэнне барысаўскага, бабруйскага, ігуменскага, мазырскага і рэчыцкага павятовых камісараў вайсковымі ўладамі былі накіраваны атрады салдатаў па 50–60 чалавек [10].

У гэты ж час займаецца стварэннем міліцыі і віцебскі камісар М. Карташоў [11, с. 15]. У Віцебску 4 сакавіка адбылося сумеснае пасяджэнне думы з удзелам начальніка Дзвінскай ваеннай акругі генерала Зуева, губернатара Хітраво, чыноўнікаў земства, прадстаўнікоў дваранства і інш. Генерал і губернатар публічна абвясцілі аб сваей прыхільнасці новаму ўраду. Галосныя думы ўзялі на сябе працу па стварэнні часовага органа ўлады «дзеля ўсталявання ў горадзе парадку, спакою і аховы асобы і маёмасці». Са свайго складу імі была вылучана рабочая група з 10 чалавек на чале з гарадскім галавой Вегліным. У ліку першаступенных былі намечаныя мерапрыемствы па раззбраенні паліцыі, арышту варожых элементаў, канфіскацыі архіваў, арганізацыі народнай міліцыі, утварэнні харчовай і юрыдычнай секцый, а таксама па ўпарадкаванні сходаў і мітынгаў.

Асобнай і істотнай для Беларусі з'явай першых месяцаў пасля Лютаўскай рэвалюцыі становіцца тое, што ваеннае камандаванне часткова бярэ на сябе функцыі цывільных улад і, часам, нават арганізацыі новых уладных органаў у сваім тыле.

Услед за адозвамі Часовага ўрада ваенныя звярталіся да насельніцтва з заклікамі. Так, 5 сакавіка 1917 г. галоўны начальнік ДВА генерал Зуеў звяртаецца з адозвай да «Грамадзян акругі», у якой абвяшчае аб пераходзе да Новага ладу, аб прызнанні гэтага ладу Галоўнакамандуючым і афіцэрамі Расійскай арміі і заклікае грамадзян захоўваць найперш парадак. У звароце таксама абвяшчаецца еднасць войска з народам. Вайсковае кіраўніцтва дэкларуе ўсебаковую падтрымку насельніцтву ў стварэнні новых стуктур – харчовых камітэтаў і міліцыі, беручы на сябе нават адказнасць за абяззбройванне старой паліцыі, і абяцае самым рашучым чынам прыпыняць рабаўніцтвы і бязладдзе [12, л. 26]. У пастановах ваенных улад таксама можна заўважыць прыкметы лібералізацыі, агульныя для ўсёй краіны ў той час. Так, 7 сакавіка 1917 г. чарговай абавязковай пастановай галоўны начальнік ДВА адмяняе ранейшыя абмежаванні, што датычыліся неасцярожнага аглашэння ці публічнага распаўсюджвання звестак пра дзейнасць кіраўнічых органаў і дзяржаўных асобаў [12, л. 27]. Ваенныя ўлады, нягледзячы на сур'езныя складанасці з забеспячэннем харчам, фуражом і амуніцыяй, на падзенне ўзроўню

дысцыпліны і кантролю над салдатамі, прыкладалі ўсе намаганні, каб трымаць пад кантролем падуладную ім прыфрантавую зону, абапіраючыся на новыя структуры цывільных улад Часовага ўрада. Прыведзеныя прыклады загадаў ваеннага камандавання дазваляюць зрабіць выснову, што на пераходным этапе армія, у асобе яе вышэйшага камандавання, стала ў пэўным сэнсе пасярэднікам паміж цэнтральнай уладай у сталіцы краіны і мясцовым апаратам, які напачатку быў неўніфікаваным і не меў дакладна акрэсленай кампетэнцыі. Сама армія ў складаных умовах эканамічнага крызісу і палітычнай няпэўнасці ўсё ж была яшчэ здольнай выконваць і прамыя абаронча функцыі і забяспечваць кардынацыю дзеянняў з грамадзянскімі ўладамі прыфрантавых губерняў.

**Заключэнне.** Такім чынам, звесткі па арганізацыі губернскіх і павятовых органаў улады пасля Лютаўскай рэвалюцыі сведчаць аб актыўнай падтрымцы Часовага ўрада насельніцтвам краю і трывалым становішчы апошняга. Сцвярджаць гэта даваляе мірны і паслядоўны пераход улады ад царскіх дзяржаўных структур мясцовага кіравання да прадстаўнікоў новага ладу. Паступовая трансфармацыя органаў улады паспрыяла таму, што Часовы ўрад успрымаўся насельніцтвам як пераемнік папярэдняй царскай улады, а значыць – легітымнай сілай у вачах законапаслухмяных грамадзян. Усведамленню гэтага спрыяў апошні закон Мікалая II – Маніфест 2 сакавіка, які афіцыйна зацвярджаў новы кабінет міністраў на чале з Г. Львовым. Ды і сама назва «Часовы ўрад» недвухсэнсоўна сведчыла пра спадзяванне на адпаведную пастанову Установчага схода аб утварэнні ўрада пастаяннага. Пра пераемнасць старой і новай сістэм сведчыла і ашчаднае стаўленне часовага ўрада да ранейшай заканадаўчай базы. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі былі выдалены толькі асобныя законы і прынятыя найбольш неабходныя новыя (12 сакавіка 1917 г. адменена пакаранне смерцю; 13 сакавіка адбылося скасаванне ваенна-палявых судоў; 17 сакавіка аб’яўлена аблягчэнне стану асоб, якія здзейснілі крымінальныя злачынствы; 20 сакавіка адбылася адмена рэлігійных і нацыянальных абмежаванняў і г. д.) [13, с. 570, 579, 585, 587–588]. Адсутнасць фактаў безсэнсоўнага руйнавання старых парадкаў выклікала давер насельніцтва, асабліва на пачатку дзейнасці Часовага ўрада. Пазнейшая тэндэнцыя да замены асобных прадстаўнікоў улады ўзмацнілася потым, пасля «Красавіцкага крызісу», а ў сакавіку, за рэдкім выключэннем, насельніцтва Беларусі безумоўна прызнала новыя органы ўлады і выконвала іх распараджэнні. У параўнанні з тым ваенна-паліцэйскім рэжымам, што існаваў тут да рэвалюцыі, новая ўлада зблізілася з народам, даўшы яму спадзяванні на вырашэнне сваіх злабадзённых патрэб. І нягледзячы на тое, што на гэтым этапе пабудовы органаў улады не назіралася адзінства ні ў назвах, ні ў складзе, ні ў вызначэнні іх дакладных функцый, менавіта новыя органы ўлады на месцах і ўзялі на сябе ўсе найважнейшыя абавязкі, прычым зрабілі гэта дастаткова паспяхова. Шмат у чым гэта можна патлумачыць іх пашыраным, сапраўды дэмакратычным складам, які абумоўліваў удзел у працы камітэтаў шырокіх пластоў насельніцтва. Праз гэта камітэты займелі досыць высокі грамадскі аўтарытэт і паклікалі да супрацоўніцтва людзей, якія шчыра віталі новы лад і аддана працавалі на карысць Айчыны.

## Літаратура


1. Сборник указов и постановлений Временного правительства. – Петроград, 1917. – Вып. I (27 февраля 1917 года – 5 мая 1917 года).
2. Речь. – 1917. – 10 марта.
3. Минский голос. – 1917. – 5 марта.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 622. – Оп. 1. – Д. 2. Распоряжения председателя Временного правительства, МВД и Витебского губернского комиссара.
5. Вестник Минского губернского комиссара. – 1917. – 26 апреля.
6. НАРБ. – Фонд 60. – Оп. 3. – Д. 216. – Л. 23.
7. Слиозберг, Г. Б. Дореволюционный строй России / Г. Б. Слиозберг. – Париж, 1933. – 287 с.
8. Гомельская копейка. – 1917. – 8 марта.
9. Вестник Минского губернского комиссара. – 1917. – 14 марта.
10. Минская газета. – 1917. – 26 апреля.
11. НАРБ. – Фонд 622. – Оп. 1. – Д. 4. Канцелярия Витебского губернского комиссара, циркуляры МВД и переписка с ними уездных комиссаров.
12. НАРБ. – Фонд 622. – Оп. 1. – Д. 7. Обязательные постановления и приказы Временного Правительства и главнокомандующего армиями Западного фронта.
13. Собрание узаконений и распоряжений Временного правительства: в 2 т. – Петроград, 1917. – Т. 1.